ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
15 КРАСАВІКА 2025 Г. № 72

# Аб змяненні пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 19 верасня 2022 г. № 322

На падставе пункта 4 артыкула 18, пункта $1^1$ артыкула 31, пункта 10 артыкула 161 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Унесці ў пастанову Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 19 верасня 2022 г. № 322 «Аб установе агульнай сярэдняй адукацыі» наступныя змены:

1.1. прэамбулу пасля лічбы «18» дапоўніць словамі «, пункта $1^1$ артыкула 31»;

1.2. у Палажэнні аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджаным гэтай пастановай:

у пункце 2 словы «і яе статутам» змяніць на словы «, яе статутам, патрабаваннямі, якія вызначаюцца школьным стандартам па форме згодна з дадаткам 1, які зацвярджаецца кіраўніком установы агульнай сярэдняй адукацыі»;

пункт 3 выключыць;

частку першую пункта 5 пасля абзаца шостага дапоўніць абзацам наступнага зместу:

«пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын патрабаваннямі заканадаўства ў галіне дарожнага руху, у тым ліку да падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын;»;

главы 3 і 4 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

## «ГЛАВА 3
## НАВУЧЭНЦЫ ВА ЎСТАНОВЕ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ. ПАТРАБАВАННІ ДА ДЗЕЛАВОГА СТЫЛЮ АДЗЕННЯ

22. Навучэнцам ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца асоба, якая засвойвае змест аднаго з відаў адукацыйных праграм, што рэалізуе ўстанова агульнай сярэдняй адукацыі. Да навучэнцаў ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі адносяцца выхаванцы, навучэнцы і слухачы.

23. Дзелавы стыль адзення – гэта строгі вытрыманы стыль адзення, які можа ўключаць агульныя (аднолькавыя) элементы школьнага адзення з размяшчэннем на адным з элементаў эмблемы ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі (пінжаку, камізэльцы, сарафане, сукенцы).

24. Для хлопчыкаў (юнакоў) у камплект дзелавога стылю адзення можа ўваходзіць пінжак, камізэлька, штаны, кашуля з кароткімі і доўгімі рукавамі, гольф, гальштук. Для дзяўчынак (дзяўчат) – пінжак, камізэлька, спадніца, штаны, блузка з кароткімі і доўгімі рукавамі, гольф, сарафан, сукенка.

У зімовы час у камплект дзелавога стылю адзення можа ўваходзіць трыкатажны світар.

## ГЛАВА 4
## ПЕДАГАГІЧНЫЯ РАБОТНІКІ, ІНШЫЯ РАБОТНІКІ ЎСТАНОВЫ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

25. Да педагагічных работнікаў установы агульнай сярэдняй адукацыі адносяцца асобы, якія рэалізуюць змест адукацыйных праграм, праграмы выхавання дзяцей, якія маюць патрэбу ў аздараўленні, аказваюць карэкцыйна-педагагічную дапамогу, ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі і (або) ажыццяўляюць кіраванне адукацыйнай дзейнасцю ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі, яе адасобленымі і структурнымі падраздзяленнямі.

26. Да іншых работнікаў установы агульнай сярэдняй адукацыі адносяцца работнікі, якія не з'яўляюцца педагагічнымі работнікамі.

Правы і абавязкі іншых работнікаў установы агульнай сярэдняй адукацыі ўстанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, статутамі, іншымі актамі заканадаўства, устаноўчымі дакументамі і іншымі лакальнымі прававымі актамі ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі, заключанымі з імі працоўнымі дагаворамі.»;

пункт 28 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«28. Непасрэднае кіраванне ўстановай агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляе кіраўнік (дырэктар, начальнік), які прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады ўласнікам (заснавальнікам) установы агульнай сярэдняй адукацыі або ўпаўнаважаным ім органам (арганізацыяй).»;

частку другую пункта 39 дапоўніць словамі «, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі ў адпаведнасці з часткай трэцяй пункта 4 артыкула 163 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі»;

абзац чацвёрты пункта 41 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«**на дзве групы пры правядзенні вучэбных заняткаў** па вучэбным прадмеце «Замежная мова» пры напаўняльнасці класа не менш за 20 навучэнцаў;»; у пункце 51:

абзац чацвёрты часткі другой пасля слова «заняткаў» дапоўніць словамі «у рамках колькасці гадзін, прадугледжаных вучэбным планам установы адукацыі, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі,»;

дапоўніць пункт часткай наступнага зместу:

«Па запытах законных прадстаўнікоў навучэнцаў установы агульнай сярэдняй адукацыі звыш вучэбных гадзін, прадугледжаных вучэбным планам гэтай установы адукацыі, могуць праводзіцца стымулюючыя заняткі, падтрымліваючыя заняткі на платнай аснове на падставе дагавора аб платным аказанні паслуг.»;

у пункце 64:

абзац другі выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«з вучнямі VIII і X класаў кадэцкіх вучылішчаў, спецыялізаваных ліцэяў праводзяцца вучэбна-палявыя зборы. З вучнямі X класа іншых відаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі (за выключэннем вучняў X класа санаторных школ-інтэрнатаў, вучылішчаў алімпійскага рэзэрву, вячэрніх класаў у сярэдняй школе) праводзяцца вучэбна-палявыя зборы (юнакі) і практычныя заняткі па медыцынскай падрыхтоўцы (дзяўчаты). Працягласць вучэбна-палявых збораў, практычных заняткаў па медыцынскай падрыхтоўцы, колькасць вучэбных гадзін на іх правядзенне вызначаецца ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам установы агульнай сярэдняй адукацыі адпаведнага віду;»;

абзац трэці выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«з вучнямі V–VIII класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, якія маюць вучэбна-вопытныя гаспадаркі, на працягу 5 дзён па 3 вучэбныя гадзіны на дзень праводзяцца практычныя заняткі, з вучнямі V–VIII класаў іншых устаноў агульнай сярэдняй адукацыі (за выключэннем вучняў V–VIII класаў санаторных школ-інтэрнатаў, гімназій – каледжаў мастацтваў, вучылішчаў алімпійскага рэзэрву, VIII класа кадэцкіх вучылішчаў, спецыялізаваных ліцэяў) на працягу 5 дзён па 3 вучэбныя гадзіны на дзень праводзіцца грамадска карысная праца (усяго 15 вучэбных гадзін на клас). Тэрміны, парадак арганізацыі практычных заняткаў, грамадска карыснай працы, зыходзячы з мясцовых умоў, вызначае кіраўнік установы агульнай сярэдняй адукацыі ці ўпаўнаважаная ім асоба. Практычныя заняткі, грамадска карысная праца арганізуюцца ў адпаведнасці з планам работы ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі;»;

у пункце 65:

абзац трынаццаты пасля слова «працы» дапоўніць словамі «з 1 верасня па 31 мая»;

абзац чатырнаццаты выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«выдзялення вучэбных гадзін на правядзенне з вучнямі X–XI класаў практычных заняткаў, што вызначаны адзінымі праграмамі падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў катэгорый «B», «B» і «C» пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын.»;

пункт 77 дапоўніць лічбай «2»;

дапоўніць Палажэнне дадаткам 1 (дадаецца);

дадатак да гэтага Палажэння выкласці ў новай рэдакцыі (дадаецца).

2. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу ў наступным парадку:

абзац першы пункта 1, абзацы першы, дваццаць пяты, дваццаць восьмы і дваццаць дзявяты падпункта 1.2 пункта 1 і дадзены пункт – пасля яе афіцыйнага апублікавання;

іншыя палажэнні дадзенай пастановы – з 1 верасня 2025 г.

**Міністр** **А.І.Іванец**

УЗГОДНЕНА

Міністэрства абароны
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства аховы здароўя
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства спорту і турызму
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства ўнутраных спраў
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства фінансаў
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства эканомікі
Рэспублікі Беларусь

Дзяржаўны камітэт судовых
экспертыз Рэспублікі Беларусь

Следчы камітэт
Рэспублікі Беларусь

Дзяржаўны пагранічны камітэт
Рэспублікі Беларусь

Брэсцкі абласны
выканаўчы камітэт

Віцебскі абласны
выканаўчы камітэт

Гомельскі абласны
выканаўчы камітэт

Гродзенскі абласны
выканаўчы камітэт

Мінскі абласны
выканаўчы камітэт

Магілёўскі абласны
выканаўчы камітэт

Мінскі гарадскі
выканаўчы камітэт

Дадатак 1
да Палажэння
аб установе агульнай
сярэдняй адукацыі
(у рэдакцыі пастановы
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.04.2025 № 72)

Форма

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Кіраўнік ______________________________
(найменне ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі)

_______________ ____________________
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)
___ __________ 20__ г.

**ШКОЛЬНЫ СТАНДАРТ**

______________________________________________
(найменне ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі)

1. Сапраўдны школьны стандарт распрацаваны на падставе Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэння аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 19 верасня 2022 г. № 322.

2. Функцыянаванне ______________________________
(найменне ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі)
(далей – Установа) забяспечваецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

3. Установа самастойная ў ажыццяўленні адукацыйнай дзейнасці, падборы і расстаноўцы кадраў, распрацоўцы і прыняцці лакальных прававых актаў, іншай дзейнасці ў межах, устаноўленых актамі заканадаўства і яе статутам.

Лакальныя прававыя акты Установы не супярэчаць актам заканадаўства.

4. Установа (у залежнасці ад віду, месца размяшчэння і ў адпаведнасці з актамі заканадаўства):

4.1. рэалізоўвае адукацыйную праграму

______________________________________________
(пачатковай адукацыі, або адукацыйную праграму пачатковай адукацыі і адукацыйную праграму базавай адукацыі, або адукацыйную праграму пачатковай адукацыі, адукацыйную праграму базавай адукацыі і адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі, або адукацыйную праграму сярэдняй адукацыі)

4.2. мае права:

рэалізоўваць адукацыйную праграму

______________________________________________
(дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйную праграму падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын, праграму выхавання дзяцей, якія маюць патрэбу ў аздараўленні)

ствараць умовы для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу або арганізоўваць вучэбна-трэніровачны працэс з мэтай падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву і (або) спартсменаў высокага класа;

ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даходы;

удзельнічаць у эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці, дзейнасці па навукова-метадычным забеспячэнні агульнай сярэдняй адукацыі;

размяшчаць у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт на афіцыйным сайце звесткі аб персанальным складзе педагагічных работнікаў (пасада служачага, прозвішча, уласнае

імя, імя па бацьку (калі такое ёсць), узровень адукацыі, кваліфікацыі, звесткі аб наяўнасці вучонай ступені, вучонага звання, а таксама пры згодзе названых асоб і іншыя звесткі пра іх);

ажыццяўляць праверку сапраўднасці дакумента аб адукацыі (пасведчання аб агульнай базавай адукацыі) шляхам накіравання запыту ў Міністэрства адукацыі аб пацвярджэнні факта яго выдачы ў выпадку ўзнікнення сумненняў у сапраўднасці дакумента аб адукацыі, выдадзенага ў Рэспубліцы Беларусь, пры прыёме (залічэнні) асобы для атрымання сярэдняй адукацыі;

уваходзіць у склад асацыяцый (саюзаў) і іншых аб'яднанняў некамерцыйных арганізацый;

ажыццяўляць міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі.

5. Установа забяспечвае:

якасць адукацыі;

падбор, прыём на працу і расстаноўку кадраў, павышэнне іх кваліфікацыі;

захаванне санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў;

стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў;

распрацоўку і прыняцце правіл унутранага распарадку для навучэнцаў;

распрацоўку правіл унутранага распарадку ў інтэрнатах*;

стварэнне бяспечных умоў знаходжання навучэнцаў, законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў, педагагічных і іншых работнікаў Установы ў будынку і на яе тэрыторыі (прапускны рэжым, пералік прадметаў і рэчываў, забароненых да захоўвання і выкарыстання вучнямі, іншыя меры);

маральнае і матэрыяльнае стымуляванне навучэнцаў, педагагічных і іншых работнікаў Установы;

меры сацыяльнай абароны навучэнцаў;

стварэнне неабходных умоў для арганізацыі харчавання і аказання медыцынскай дапамогі;

стварэнне неабходных умоў для пражывання навучэнцаў*;

удзел у фарміраванні кантрольных лічбаў прыёму;

азнаямленне асоб, законных прадстаўнікоў непаўналетніх асоб пры прыёме (залічэнні) ва Установу з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, устаноўчым дакументам, інфармацыяй аб наяўнасці ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, правіламі ўнутранага распарадку ў інтэрнатах*, іншымі лакальнымі прававымі актамі Установы, якія змяшчаюць правы і абавязкі навучэнцаў, а таксама па іх запыце – з вучэбна- праграмнай дакументацыяй;

распрацоўку з удзелам органа самакіравання, у які ўваходзяць законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў, парадку атрымання законнымі прадстаўнікамі непаўналетніх навучэнцаў інфармацыі аб ходзе і змесце адукацыйнага працэсу, метадах навучання і выхавання, выніках вучэбнай дзейнасці навучэнцаў;

садзейнічанне ўпаўнаважаным дзяржаўным органам, іншым арганізацыям у правядзенні кантролю за забеспячэннем якасці адукацыі.

6. Ва Установе не дапускаецца стварэнне і дзейнасць палітычных партый, а таксама стварэнне, ананімная ці іншая супярэчная заканадаўству дзейнасць рэлігійных арганізацый.

7. Выкарыстанне пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі метадаў і сродкаў навучання і выхавання, адукацыйных тэхналогій, якія наносяць шкоду фізічнаму або псіхічнаму здароўю навучэнцаў, не дапускаецца.

8. Пры рэалізацыі эксперыментальнага і інавацыйнага праекта забяспечваецца захаванне правоў і законных інтарэсаў удзельнікаў адукацыйнага працэсу, прадстаўленне і атрыманне адукацыі, узровень і якасць якой не могуць быць ніжэйшыя за патрабаванні, устаноўленыя адукацыйнымі стандартамі агульнай сярэдняй адукацыі.

9. Ва Установе створаны ўмовы для арганізацыі адукацыйнага працэсу:

вучэбна-метадычнае забеспячэнне;

кадравае забеспячэнне;

матэрыяльна-тэхнічная база.

10. Кадравыя ўмовы рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ва Установе прадугледжваюць:

укамплектаванасць педагагічнымі і іншымі работнікамі ў адпаведнасці са штатным раскладам;

наяўнасць службовых (рабочых) інструкцый педагагічных, кіруючых і іншых работнікаў;

забеспячэнне павышэння кваліфікацыі педагагічных работнікаў;

правядзенне атэстацыі педагагічных работнікаў.

11. Матэрыяльна-тэхнічныя ўмовы рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі забяспечваюць:

11.1. засваенне зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі;

11.2. стварэнне ўмоў для актывізацыі самастойнай вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, задавальнення іх індывідуальных адукацыйных запытаў, развіцця творчых здольнасцей, уключэння ў праектную, даследчую дзейнасць, іншыя віды сацыяльна значнай дзейнасці;

11.3. эфектыўнае выкарыстанне ў адукацыйным працэсе сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;

11.4. укараненне электронных сэрвісаў, якія выкарыстоўваюцца:

педагагічнымі работнікамі пры арганізацыі, ажыццяўленні і аналізе вынікаў адукацыйнага працэсу;

навучэнцамі на вучэбных занятках (занятках), пры выкананні дамашніх заданняў, у вучэбна-даследчай і праектнай дзейнасці;

законнымі прадстаўнікамі непаўналетніх навучэнцаў як удзельнікамі адукацыйнага працэсу.

12. Установа мае:

памяшканні, кабінеты, майстэрні, пляцоўкі, забяспечаныя мэбляй, інвентаром, сродкамі навучання і выхавання, неабходнымі для арганізацыі адукацыйнага працэсу;

памяшканні для заняткаў фізічнай культурай і спортам;

памяшканне медыцынскага прызначэння;

памяшканні для арганізацыі харчавання навучэнцаў, педагагічных і іншых работнікаў Установы, абсталяваныя ў адпаведнасці са спецыфічнымі санітарна- эпідэміялагічнымі патрабаваннямі, якія прад’яўляюцца да ўтрымання і эксплуатацыі ўстаноў адукацыі;

іншую маёмасць у адпаведнасці з санітарна-эпідэміялагічнымі патрабаваннямі.

13. Ва Установе выконваюцца патрабаванні актаў заканадаўства да:

санітарна-гігіенічнага забеспячэння;

пажарнай бяспекі;

транспартнага забеспячэння навучэнцаў;

арганізацыі бяспечнай эксплуатацыі вулічна-дарожнай сеткі і тэхнічных сродкаў, арганізацыі дарожнага руху ў месцах размяшчэння Установы;

арганізацыі бяспечнай эксплуатацыі фізкультурна-спартыўных збудаванняў, спартыўнага інвентару і абсталявання;

устаноўленага тэрміну і неабходнага аб’ёму бягучага і капітальнага рамонту.

14. Забараняюцца дзеянні (бяздзеянне), якія прыводзяць да неабгрунтаванага скарачэння або пагаршэння матэрыяльна-тэхнічнай базы Установы.

15. Педагагічныя работнікі Установы ў адпаведнасці з актамі заканадаўства маюць права на:

абарону прафесійнага гонару і годнасці;

забеспячэнне ўмоў для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці;

забеспячэнне ўмоў для аховы жыцця і здароўя падчас адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў;

творчую ініцыятыву, свабоду выбару педагагічна абгрунтаваных форм і метадаў навучання і выхавання, вучэбных выданняў і сродкаў навучання і выхавання;

доступ да вучэбна-праграмнай, вучэбна-метадычнай дакументацыі, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў;

удзел у абнаўленні, распрацоўцы і вызначэнні структуры і зместу структурных элементаў навукова-метадычнага забеспячэння адукацыі;

удзел у навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай, міжнароднай дзейнасці;

удзел у кіраванні Установай;

павышэнне кваліфікацыі;

маральнае і матэрыяльнае заахвочванне за поспехі ў педагагічнай, навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ў сістэме адукацыі;

аб’яднанне ў прафесійныя саюзы, іншыя грамадскія аб’яднанні, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству;

штомесячную кампенсацыю выдаткаў на набыццё вучэбнай і метадычнай літаратуры;

бясплатную перавозку да месца працы (да ўстаноў дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі) і назад школьнымі аўтобусамі па маршруце іх руху ў выпадку адсутнасці аўтамабільных перавозак пасажыраў транспартам агульнага карыстання, якія забяспечваюць прыбыццё педагагічнага работніка да пачатку яго працоўнага дня да месца працы і назад, і пры наяўнасці свабодных пасадачных месцаў у школьным аўтобусе**.

16. Педагагічныя работнікі Установы абавязаны:

удзельнічаць у рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі;

арганізоўваць работу на аснове безумоўнай узаемнай павагі навучэнцаў, іх законных прадстаўнікоў, калег;

добрасумленна і якасна выконваць прафесійныя абавязкі, пастаянна ўдасканальваць свой прафесіяналізм;

фарміраваць у навучэнцаў духоўна-маральныя каштоўнасці, грамадзянскасць, патрыятызм, імкненне да здаровага ладу жыцця;

быць сумленнымі, шчырымі, справядлівымі і адкрытымі для зносін;

праяўляць добразычлівасць, ветлівасць і тактоўнасць, пазбягаць канфліктаў ва ўзаемаадносінах;

у межах заканадаўства захоўваць тайну асабіста даверанай інфармацыі;

садзейнічаць стварэнню пазітыўных узаемаадносін у калектыве навучэнцаў і педагагічным калектыве;

выконваць этычныя прынцыпы і нормы ў медыяпрасторы;

знешнім выглядам, паводзінамі, культурай зносін адпавядаць статусу педагагічнага работніка.

17. Педагагічныя работнікі Установы не маюць права аказваць платныя кансультацыйныя паслугі па асобных вучэбных прадметах, модулях, тэмах, у тым ліку дапамогу ў падрыхтоўцы да ўступных іспытаў (рэпетытарства), навучэнцам, калі гэта прыводзіць да канфлікту інтарэсаў педагагічнага работніка.

18. Педагагічным работнікам Установы забараняецца выкарыстоўваць адукацыйны і выхаваўчы працэсы ў палітычных мэтах або для пабуджэння навучэнцаў да дзеянняў, якія супярэчаць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і актам заканадаўства.

19. Навучэнцы Установы маюць права на:

атрыманне адукацыі ў адпаведнасці з адукацыйнымі праграмамі агульнай сярэдняй адукацыі;

стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі з улікам асаблівасцей іх псіхафізічнага развіцця, стану здароўя і пазнавальных магчымасцей;

атрыманне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і ў парадку, які вызначаецца Палажэннем аб установе дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 25 ліпеня 2011 г. № 149;

павагу сваёй чалавечай годнасці, абарону ад фізічнага і (або) псіхічнага гвалту, жорсткага, грубага або абразлівага абыходжання, знявагі;

ахову жыцця і здароўя падчас адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў;

карыстанне падручнікамі (вучэбнымі дапаможнікамі) у адпаведнасці з заканадаўствам;

бясплатнае карыстанне бібліятэкай, вучэбнай і фізкультурна-спартыўнай базай Установы;

удзел у кіраванні Установай;

адпачынак на перапынках, аздараўленне падчас канікулаў;

стварэнне спрыяльных умоў для самаадукацыі;

аб’ектыўную ацэнку вынікаў вучэбнай дзейнасці;

захаванне месца ва Установе ў выпадку накіравання для навучання і лячэння ў санаторную школу-інтэрнат;

вывучэнне зместу вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» ў адпаведнасці з групай здароўя;

наведванне стымулюючых і (або) падтрымліваючых заняткаў;

выбар факультатыўных заняткаў у межах устаноўленай вучэбным планам Установы колькасці гадзін факультатыўных заняткаў і з улікам максімальнага дапушчальнага аб’ёму вучэбнай нагрузкі на аднаго навучэнца на тыдзень, устаноўленай спецыфічнымі санітарна-эпідэміялагічнымі патрабаваннямі да ўтрымання і эксплуатацыі ўстаноў адукацыі;

вывучэнне асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні ў адпаведнасці з вучэбным планам Установы;

засваенне зместу адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын;

атрыманне харчавання ў парадку, вызначаным заканадаўствам;

удзел у алімпіядах, конкурсах, турнірах, канферэнцыях і іншых адукацыйных мерапрыемствах, спартыўна-масавых, фізкультурна-аздараўленчых, іншых мерапрыемствах;

заахвочванне да поспехаў у вучэбнай, спартыўна-масавай, грамадскай, навуковай дзейнасці, а таксама ў адукацыйных мерапрыемствах;

атрыманне сацыяльна-педагагічнай падтрымкі і псіхалагічнай дапамогі;

удзел у маладзёжных і іншых грамадскіх аб’яднаннях, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству;

удзел у органах вучнёўскага самакіравання ва Установе;

абарону ад любых супрацьпраўных замахаў.

20. Навучэнцы Установы абавязаны:

праяўляць ветлівасць і добразычлівасць у зносінах з настаўнікамі, іншымі ўдзельнікамі адукацыйнага працэсу, быць сумленнымі і шчырымі;

актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці Установы;

добрасумленна вучыцца, імкнуцца да якаснага авалодання ведамі, уменнямі, навыкамі, самавыхавання, развіцця сваіх здольнасцей;

добрасумленна і адказна ставіцца да засваення зместу адукацыйных праграм, праграм выхавання;

паважліва ставіцца да членаў сваёй сям’і, настаўнікаў, навучэнцаў і іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

выконваць патрабаванні настаўнікаў і бацькоў па выкарыстанні прылад сувязі і відэазапісу, інтэрнэт-сувязі, выконваць правілы паводзін у інтэрнэт-прасторы;

падтрымліваць парадак на сваім працоўным месцы;

клапаціцца аб сваім здароўі і здароўі іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу, паважліва ставіцца да іх нацыянальных і рэлігійных пачуццяў;

беражліва адносіцца да маёмасці Установы, падтрымліваць чысціню і парадак ва Установе і на яе тэрыторыі.

21. Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў Установы маюць права на:

азнаямленне з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, устаноўчым дакументам, інфармацыяй аб наяўнасці ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі

аб дзяржаўнай акрэдытацыі, правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, правіламі ўнутранага распарадку ў інтэрнатах (пры наяўнасці), іншымі лакальнымі прававымі актамі, якія змяшчаюць правы і абавязкі навучэнцаў, законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў, а таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

атрыманне інфармацыі аб ходзе і змесце адукацыйнага працэсу, метадах навучання і выхавання, выніках вучэбнай дзейнасці навучэнцаў у парадку, які вызначаецца кіраўніком Установы з удзелам органа самакіравання, у які ўваходзяць асобы з ліку законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў.

22. Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў Установы абавязаны:

забяспечваць умовы для атрымання адукацыі і развіцця навучэнцаў;

ствараць умовы, неабходныя для вучобы, сацыялізацыі, умацавання здароўя, самаразвіцця і самарэалізацыі асобы дзіцяці;

паважаць гонар і годнасць іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

забяспечваць выкананне навучэнцамі, законнымі прадстаўнікамі якіх яны з'яўляюцца, патрабаванняў устаноўчых дакументаў, правіл унутранага распарадку для навучэнцаў, правіл унутранага распарадку ў інтэрнатах*;

пазбягаць канфліктаў ва ўзаемаадносінах з настаўнікамі, іншымі бацькамі, праяўляць добразычлівасць, ветлівасць і тактоўнасць;

падтрымліваць з удзельнікамі адукацыйнага працэсу канструктыўныя і даверлівыя адносіны, узаемадзейнічаць з настаўнікамі па пытаннях выхавання і навучання дзяцей;

садзейнічаць стварэнню пазітыўных узаемаадносін у калектыве навучэнцаў і бацькоўскай супольнасці;

прытрымлівацца этычных прынцыпаў і правіл паводзін, у тым ліку ў інтэрнэт-прасторы, паважліва ставіцца да нацыянальных і рэлігійных пачуццяў удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

знешнім выглядам, паводзінамі, культурай зносін быць станоўчым прыкладам для свайго дзіцяці.

23. Меры дысцыплінарнай адказнасці, умовы і парадак іх прымянення ў адносінах да навучэнцаў Установы вызначаюцца згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

______________________________

* Пры адсутнасці інтэрната не паказваецца.

** Паказваецца пры неабходнасці.

Дадатак 2
да Палажэння
аб установе агульнай
сярэдняй адукацыі
(у рэдакцыі пастановы
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.04.2025 № 72)

Форма

**АСАБОВАЯ КАРТКА ВУЧНЯ № ____**

Прозвішча ______________________________________________________

Уласнае імя ____________________________________________________

Імя па бацьку (калі такое маецца) _________________________________

Дата нараджэння ________________________________________________

_______________________________________________________________

(нумар і дата выдачы пасведчання аб нараджэнні або дакумента, які сведчыць пра асобу)

_______________________________________________________________

Месца жыхарства (месца знаходжання) ______________________________________________

_____________________________________________________________________________

Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) законных прадстаўнікоў вучня

_____________________________________________________________________________

_____________________________________________________________________________

Звесткі аб прыёме (залічэнні) асобы ва ўстанову адукацыі для атрымання адукацыі і аб спыненні адукацыйных адносін (адлічэнні)

| Дата прыёму (залічэння) вучня ва ўстанову адукацыі | Дата адлічэння вучня з установы адукацыі |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

Звесткі аб выніковай атэстацыі вучня пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, аб ацэнцы яго паводзін

| № п/п | Вучэбныя прадметы | Навучальны год, клас | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | |
| 1 | Беларуская мова | | | | | | | | | | | | |
| 2 | Беларуская літаратура | | | | | | | | | | | | |
| 3 | Руская мова | | | | | | | | | | | | |
| 4 | Руская літаратура | | | | | | | | | | | | |
| 5 | Замежная мова (____) | | | | | | | | | | | | |
| 6 | Матэматыка | | | | | | | | | | | | |
| 7 | Інфарматыка | | | | | | | | | | | | |
| 8 | Гісторыя Беларусі | | | | | | | | | | | | |
| 9 | Сусветная гісторыя | | | | | | | | | | | | |
| 10 | Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі | | | | | | | | | | | | |
| 11 | Грамадазнаўства | | | | | | | | | | | | |
| 12 | Чалавек і свет | | | | | | | | | | | | |
| 13 | Геаграфія | | | | | | | | | | | | |
| 14 | Біялогія | | | | | | | | | | | | |
| 15 | Фізіка | | | | | | | | | | | | |
| 16 | Астраномія | | | | | | | | | | | | |
| 17 | Хімія | | | | | | | | | | | | |
| 18 | Выяўленчае мастацтва | | | | | | | | | | | | |
| 19 | Музыка | | | | | | | | | | | | |
| 20 | Чарчэнне | | | | | | | | | | | | |
| 21 | Фізічная культура і здароўе | | | | | | | | | | | | |
| 22 | Працоўнае навучанне | | | | | | | | | | | | |
| 23 | Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка | | | | | | | | | | | | |
| 24 | Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура) | | | | | | | | | | | | |
| 25 | Асновы бяспекі жыццядзейнасці | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | |
| | Паводзіны | | | | | | | | | | | | |
| | Вынікі атэстацыі | | | | | | | | | | | | |
| | Подпіс класнага кіраўніка | | | | | | | | | | | | |
| | Подпіс кіраўніка ўстановы адукацыі | | | | | | | | | | | | |

Кароткія звесткі аб удзеле ў алімпіядах, конкурсах, турнірах, фестывалях, канферэнцыях, спартыўна-масавай рабоце, грамадскай дзейнасці, узнагароды і заахвочванні

_____________________________________________________________________________

_____________________________________________________________________________